Как здоровье людей ухудшается после сильного солнечного удара, так и поручик вернулся в гостиницу настолько разбитый усталостью, «точно совершил огромный переход», а вернувшись на пароход, «сидел под навесом на палубе, чувствуя себя постаревшим на десять лет», «томясь мучительной завистью ко всем неизвестным ему, не страдающим людям» [1, с. 196]. В рассказе «Солнечный удар» о любви говорится как о высшем даре судьбы, и, как всегда у Бунина, чем прекраснее этот дар, тем он скоротечней.

В повести «Митина любовь» И. А. Бунин показывает еще один образец этого чувства. Уже из самого названия произведения видно, что основная его тематика — любовь. И, несмотря на то, что, к данной теме Бунин обращался в своем творчестве неоднократно, «Митина любовь» отличается от прочей любовной прозы писателя.

Сюжет «Митиной любви», казалось бы, малооригинален: главный герой произведения — молодой человек по имени Митя, который влюбляется в Катю — ученицу театральной школы. Митя постоянно ревнует свою возлюбленную, подозревая в измене с директором школы, и, в скором времени узнав, что Катя ему действительно неверна, Митя пускает пулю себе в висок. И все же эту достаточно шаблонную историю неразделенной любви, закончившейся самоубийством героя, Бунин преподносит по-новому.

Прежде всего стоит выделить тонкость психологизма повести. Бунин мастерски передает внутреннее состояние своего героя, применяя прием параллелизма мира человека и окружающего мира. Через картины природы мы видим, как автор показывает Митины мучения. Особенно символичен здесь образ дождя, который отображает трагичность переживаний главного героя. Дождь усиливается по мере обострения Митиных чувств и к концу повести достигает наивысшей точки напряжения — грозы. Митя — натура достаточно чувствительная и глубоко переживающая все происходящее с ним. Именно в мучительных переживаниях героя И. А. Бунин, прежде всего, раскрыл всепроникающую силу любви и ее непреодолимую власть над человеком.

Автор сочувствует главному герою своей повести и жалеет этого простого, доброго юношу, способного на глубокие искренние чувства. И гибель Мити автор в данном случае определяет не самой его любовью, а объектом его любви — Катей, весь мир которой построен на игре и фальши, внесшей в жизнь Мити враждебное опустошающее начало. В этом и заключается скрытый смысл бунинской повести, актуальной до тех пор, пока проблема, с которой столкнулся Митя, не перестанет мучить человечество.

**Заключение.** Тема любви — одна из ведущих тем в творчестве И. А. Бунина. Почти во всех произведениях на эту тему история любви предстает через воспоминания героев, а исход любви трагичен. Этот трагический характер любви подчеркивается смертью.

Вечную тайну любви и вечную драму влюбленных писатель видит в том, что человек неволен в своей любовной страсти: любовь есть чувство изначально стихийное, неотвратимое, а счастье часто становится недостижимым.

Любовь в произведениях Бунина мимолетна и неуловима. Герои его произведений никогда не обретают вечного счастья, они только могут вкусить запретный плод, насладиться им, а потом лишиться радостей, надежд и даже жизни. Почему же так происходит? Все очень просто. Дело в том, что, по мнению Ивана Бунина, любовь — это счастье, а счастье мимолетно, непостоянно, следовательно, любовь не может быть постоянной, иначе она станет привычкой, обыденностью, а такое невозможно. Но, несмотря на кратковременность, любовь все равно вечна: она навсегда остается в памяти героев самым ярким и прекрасным воспоминанием.

**Список цитируемых источников**


1. *Михед Н. В.* Русские писатели — лауреаты Нобелевской премии : учеб. пособие / Н. В. Михед. — Минск : БГЭУ, 2002. — 403 с.
2. *Бунин И. А.* Последнее свидание. Избранное / сост. П. З. Шевцов. — Минск : Маст. літ., 1978. — 320 с.


УДК811.161.3-31*Я.Колас


**В. А. Назаранка**

*Установа адукацыі «Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны», Гомель*


## ПРАСТОРАВА-ЧАСАВАЯ КАНСТРУКЦЫЯ ЖЫЦЦЁВАГА ШЛЯХУ БЕЛАРУСА НА МАТЭРЫЯЛЕ РАМАНА ЯКУБА КОЛАСА «НА РОСТАНЯХ»

**Уводзіны.** Паняцці «час» і «прастора» — вызначальныя параметры існавання свету і асноватворныя формы чалавечага досведу. Пераадоленне прасторы і часу і авалоданне імі — гэта экзістэнцыяльная задача, якую чалавецтва вырашае ў сваёй гісторыі, а чалавек — у сваім жыцці. Чалавек суб’ектывуе прастору і час, раз’ядноўвае, яднае іх, трансфармуе, мяняе і ператварае адно ў другое. Хранатоп — гэта жывое сінкрэтычнае вымярэнне прасторы і часу, у якім яны непадзельныя.

Хранатоп (грэч. chromos час, topos месца) — узаемасувязь часавых і прасторавых характарыстык з’яў, паказаных у мастацкім творы. Змест літаратурнага твора заўсёды ўключаецца ў рамкі прасторы і часу: прыкметы часу раскрываюцца ў прасторы, а прастора вымяраецца часам [1, с. 276—277].

© Назаранка В. А., 2017

Репозиторий БарГУ

Тэрмін «хранатоп» як эстэтычная катэгорыя належыць Міхаілу Бахціну, які лічыў, што «…жанры і жанравыя разнавіднасці вызначаюцца менавіта хранатопам… Час тут згушчаецца, робіцца больш тугім, становіцца мастацка бачным; прастора ўцягваецца ў рух часу, сюжэту і гісторыі» [2, с. 121—122]. У канцэпцыі Міхаіла Бахціна хранатоп — гэта перакрыжаванне часу і прасторы, як бы кропка сустрэчы чалавека і быцця. Дзякуючы таму, што рэальныя прасторава-часавыя формы пераўтвораны, чалавек прыстасоўваецца да рэальнасці, актыўна дзейнічае, рызыкуе, нешта стварае, пераадольвае і авалодвае гэтымі формамі быцця.

Хранатоп спрыяе больш глыбокаму разуменню ўнутранага свету герояў мастацкага твора. Дадзеная катэгорыя перадае сістэму стасункаў чалавека з акаляючай рэчаіснасцю. Аб'ядноўваючы ў сабе прасторава-часавыя ўяўленні пісьменніка, яго герояў, чытача, час-прастора служыць спосабам адлюстравання і ўспрымання прасторава-часавых адносін літаратурнага твора. Выступаючы ў якасці элементаў структуры, тэмы зместу, хранатоп робіцца найважнейшай характарыстыкай мастацкага вобраза.

**Асноўная частка.** Творчасць Якуба Коласа з'яўляецца яркім прыкладам класічнай беларускай літаратуры. Імя Якуба Коласа займае вельмі важнае месца ў беларускай літаратуры. Мастацкая творчасць Якуба Коласа здзіўляе незвычайнай эпічнай шырынёй, выключна глыбокім пранікненнем ва ўнутраны свет чалавека, высакароднасцю, вышынёй маральных патрабаванняў як асновай жыцця чалавечага грамадства.

Творы Якуба Коласа ўяўляюць сабой шырокі пласт для даследаванняў у галіне лексікі. Яны характарызуюцца высокай насычанасцю хранатопаў. Якуб Колас умела выкарыстоўвае ўсе хранатопы ў сваіх тэкстах, тым самым удакладняючы характарыстыку герояў мастацкага твора, ствараючы мастацкі вобраз больш канкрэтным і дасканалым. Так, удала выкарыстоўваючы шматлікія мастацкія хранатопы ў сваіх творах, Якуб Колас стварыў свой уласны непаўторны аўтарскі стыль.

Кожны літаратурны твор так ці інакш адлюстроўвае рэальны свет — як матэрыяльны, так і ідэальны. Натуральнымі формамі існавання гэтага свету з'яўляюцца час і прастора. Аднак свет твора заўсёды ў той ці іншай ступені ўмоўны, і, вядома, умоўныя таксама час і прастора.

Характар умоўнасці часу і прасторы ў пэўнай ступені залежыць ад роду літаратуры. Максімальная ўмоўнасць выражана ў лірыцы, бо яна адрозніваецца найбольшай экспрэсіяй і арыентавана на ўнутраны свет лірычнага героя. Умоўнасць часу і прасторы ў драме звязана з магчымасцямі пастаноўкі. Адсюль вынікае знакамітае правіла трох адзінстваў: месца, часу і дзеяння. У эпасе фрагментарнасць часу і прасторы, пераходы з аднаго часу ў іншы, прасторавыя перамяшчэнні ажыццяўляюцца лёгка, дзякуючы фігуры апавядальніка — злучаючым звяном паміж адлюстраваным жыццём і чытачом. Так, напрыклад, аўтар можа зрабіць час павольным або зусім яго спыніць пры развагах літаратурнага героя, пры апісаннях і замалёўках прыроды, ці ўвогуле праматаць яго як кінафільм.

У кожнай жывой сістэме ёсць уласныя часавыя рытмы і тэмпы змянення. Усім вядомы факт, што Зямля абарочваецца вакол сваёй восі, як заканамернасць — змена пораў года. Людзі заўважаюць тое, што рухаецца, і не бачаць нерухомага. Заўважыць рух — значыць, заўважыць і рухомы аб'ект. Гэта ж датычыцца і змен у часе.

Успрыманне падобных працэсаў змянення ўласціва толькі чалавеку, які менавіта праз час успрымае ўсе змены, што адбываюцца ў навакольным свеце.

Сучасны чалавек без усялякіх цяжкасцей аперыруе паняццямі, усведамляючы самае аддаленае мінулае. На сённяшні момант чалавецтва здольна больш-менш прадбачыць будучыню, планаваць сваю дзейнасць і прадвызначаць развіццё навукі, тэхнікі, вытворчасці, грамадства далёка наперад. Гэта здольнасць тлумачыцца высокай ступенню спарадкаванасці часавых сістэм, якімі мы карыстаемся зараз. Час і прастора ўяўляюцца нам як абстракцыя. І ў старажытнасці, і ў сярэднія вякі, і ў эпоху Адраджэння былі людзі, якія задумваліся над праблемай незваротнасці, хуткабежнасці часу. Калі ўзяць грамадства ў цэлым, то ніколі ў папярэдніх эпохах час не шанаваўся гэтак значна, як цяпер, і не займаў такога месца ў свядомасці чалавека. Сёння свядомасць сучаснага чалавека вызначаецца яго адносінамі да часу.

Мастацкая літаратура ўзнаўляе пераважна такія жыццёвыя працэсы, якія працякаюць у часе, гэта значыць, чалавечую жыццядзейнасць, што звязана з ланцужком перажыванняў, думак, намераў, учынкаў, падзей. Час у літаратуры — асноўная і неад'емная перадумова сюжэтнага разгортвання.

Дзеянне ў літаратуры заўсёды знаходзіцца ў часавых межах, заўсёды развіваецца па законах знешняй храналагічнай паслядоўнасці і ўнутранай абумоўленасці сучаснага і будучага — мінулым.

У літаратуры час і прастора з'яўляюцца найважнейшымі ўласцівасцямі вобраза. Розныя вобразы патрабуюць розных прасторава-часавых каардынат. Так, у творы Якуба Коласа «На ростанях» мы можам назіраць за зменай пораў года, за тым, як дзень змяняе ноч, таксама даецца паралельнае апісанне дзеянняў галоўнага героя Андрэя Лабановіча.

«Гэты вечар прайшоў вельмі хутка.

У тую хвіліну, калі Лабановіч вярнуўся ад пана падлоўчага, гадзіннік якраз збіраўся выбіваць час. Пашумеўшы і паскрыпеўшы, колькі яму было трэба, ён прабіў роўна поўнач…» [3, с. 90].

Чытач разам з настаўнікам Андрэем Лабановічам назірае, як дзень змяняе ноч, як абуджаецца прырода ці наадварот, пагружаецца ў глыбокі сон.

«Вечарэла. З балот пацягнула цёплаю вільгаццю. Над лозамі рассцілаўся бялявы туман. У алешніку пры лесе засвістаў салавей. А лес, нерухліва развесіўшы свае галіны, маўкліва слухаў гэты гімн вясне і маладому жыццю…» [3, с. 190].



Рэпазіторый БарДУ

Якуб Колас, нібы чараўнік з казкі, пераносіць свайго чытача на абшары беларускага Палесся, паказвае кожнае імгненне, каб мы не змаглі ўпусціць ніводнай дэталі. Дзякуючы гэтаму, мы спасцігаем у мастацкай літаратуры дух часу, чэрпаем заканамернасці руху, праблемы развіцця і станаўлення, пазнаём менталітэт свайго народа.

Інтэнсіўнасць мастацкага часу выяўляецца ў яго насычанасці падзеямі. Таму мы можам з упэўненасцю сказаць, што час у Якуба Коласа менавіта такі. Час у пісьменніка заўсёды вызначаны, таму чытачу вельмі лёгка ўявіць сабе, у якіх умовах знаходзіцца літаратурны герой.

Мастацкі час абумоўлены жанравай спецыфікай твора, мастацкім метадам, аўтарскімі ўяўленнямі, а таксама тым, у рэчышчы якой літаратурнай плыні ці кірунку гэты твор створаны. Таму формы мастацкага часу адрозніваюцца зменлівасцю і шматграннасцю.

Катэгорыя часу мае ўсё большае і большае значэнне ў сучасным разуменні свету і ў сучасным адлюстраванні гэтага свету ў мастацтве. Час адваеўвае і падпарадкоўвае сабе ўсё буйнейшае месца ў свядомасці людзей. Гістарычнае разуменне рэчаіснасці пранікае ва ўсе формы і звёны мастацкай творчасці. Але справа не толькі ў гістарычнасці, а і ў імкненні ўвесь свет успрымаць праз час і ў часе. Літаратура ў большай меры, чым любы іншы від мастацтва, робіцца мастацтвам часу. Час — яго аб'ект, суб'ект і спосаб выяўлення. Свядомасць і адчуванне руху і зменлівасці свету ў разнастайных формах часу пранізвае сабой літаратуру.

Праблема хранатопу з'яўляецца аб'ектам пільнай увагі ў сучасным літаратуразнаўстве. Цікавасць да яе навукоўцаў абумоўлена пастаянным абнаўленнем уяўленняў пра катэгорыі часу-прасторы. Дасягненні фізікі, філасофіі, сацыялогіі, псіхалогіі значна паглыбілі канцэпцыю хранатопу.

**Заключэнне.** Пры разглядзе хранатопаў у трылогіі Якуба Коласа «На ростанях» можна зрабіць наступныя высновы: час і прастора ў мастацкім творы спрыяюць раскрыццю эстэтычных поглядаў пісьменніка. Дзякуючы ім, складаецца цэласная карціна быцця, што стала аб'ектам разумення ў літаратуры. Уважлівы, дапытлівы чытач, які здольны адчуць спецыфіку хранатопу ў творах пісьменніка, можа заўважыць, як і пры якіх умовах змяняецца прасторава-часавае вымярэнне, абавязкова зразумее, што менавіта хацеў сказаць аўтар.

Такім чынам, мы пацвердзілі нашу думку пра тое, што выкарыстанне хранатопу ў творах Якуба Коласа апраўдана мэтай перадаць намер аўтара ў поўнай яго меры. Адметная тэма, якой пакуль прысвечана незаслужана мала прац, — гэта ўвядзенне фактару часу ў мастацкія тэксты, высвятленне яго ролі, вобразаў і спосабаў наяўнасці ў тэксце і многіх іншых уласцівасцей, не характэрных рэальнаму фізічнаму часу, але значных у мастацтве, культуры ў цэлым.

Даследаванне катэгорыі хранатопаў у структуры твораў мастацкай літаратуры з'яўляецца перспектыўным накірункам. Іх вывучэнне дазваляе глыбей спасцігнуць асаблівасці пабудовы індывідуальна-аўтарскай выявы свету пісьменніка, выявіць своеасаблівасць яго канцэпцыі быцця, зразумець тэндэнцыі і заканамернасці гісторыка-мастацкага працэсу пэўнага перыяду.

**Спіс цытуемых крыніц**


1. *Рагойша, В. П.* Літаратуразнаўчы слоўнік: тэрміны і паняцці: для школьнікаў і абітурыентаў / В. П. Рагойша. — Мінск : Нар. асвета, 2009. — 303 с.
2. *Бахтин, М. М.* Формы времени и хронотопа в романе. Очерки по исторической поэтике / М. М. Бахтин. — М., 1976. — 429 с.
3. *Колас, Я.* Збор твораў : у 14 т. / Я. Колас. — Мінск : Маст. літ., 1972—1978. — Т. 9 : На ростанях. — 1974. — 800 с.


УДК 821.161.3:82-31

**Н. А. Нясмашнева**
*Установа адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт», Баранавічы*

## ЭЛЕМЕНТЫ МАТЫЎНАЙ ПРАСТОРЫ РАМАНА КУЗЬМЫ ЧОРНАГА «ІДЗІ, ІДЗІ»

**Уводзіны.** Паняцце «матыў» (лац. moveo рухаю, цераз фр. motif матыў) мае міждысцыплінарны характар. Матыў — адно з ключавых паняццяў псіхалагічнай тэорыі дзейнасці, якая распрацоўвалася вядомымі псіхолагамі А. М. Леонцьевым і С. Л. Рубінштэйнам. Найбольш простае вызначэнне матыву ў рамках гэтай тэорыі: «Матыў — гэта апрадмечаная патрэба» [2, с. 7]. Матыў у музыцы — найменшы элемент музычнай структуры, найпростая рытмічная адзінка мелодыі, якая складаецца з кароткай паслядоўнасці гукаў, аб'яднанай адным лагічным акцэнтам, якая мае самастойнае выразнае значэнне. У агульнараспаўсюджаным значэнні — напеў, мелодыя. Матыў у літаратурным творы часцей за ўсё разумеецца як частка, элемент сюжэта. Усякі сюжэт уяўляе сабой перапляценне матываў, якія цесна ўзаемазвязаны, «урастаюць» адзін у аднаго. Той самы матыў можа ляжаць у аснове розных сюжэтаў і набываць у іх межах разнастайныя сэнсы.

**Асноўная частка.** У беларускай літаратуры найбольш распаўсюджаны матывы роднай хаты (дома), матыў бяседы, матыў шляху. У беларускай літаратуры рэдка сустракаюцца паэтычна ўзвышаныя апісанні роднай хаты. Часцей яна паказана звычайнай, а то і беднай, старой, недагледжанай. Ужо ў гэтай яе асаблівасці

© Нясмашнева Н. А., 2017



Репозиторий БарГУ